нормамі, дазвалялі атрымаць першае ўяўленне пра дабрыню (іх можна выкарыстоўваць з першай малодшай групы). З узростам пашыралася колькасць гульняў і іх змест, яны значна ўскладняліся [2, с. 11].

Беларусы маюць своеасаблівую школу пешчання. Немаўлятак забаўлялі, прывучалі іх да элементарных гульняў з дапамогай забаўлянак, якіх багата накоплена ў народнай творчасці. Так, робячы гімнастыку, падкідвалі дзіця на руках, пахлопвалі яго па спінцы, пагладжвалі па жывоціку, згіналі ножкі, суправаджалі дзеянні спецыяльнымі забаўлянкамі, як імправізаванымі, так і ўстойлівымі, вядомымі ў той ці іншай мясцовасці.

Дух змагарства, магчымасць паспрабаваць свае сілы і вынослівасць былі характэрныя для гульняў дзяцей розных узростаў. Самай простай і распаўсюджанай сярод іх была гульня «ў абгонку» («перагонкі», «хто каго абгоніць»). Сіла і спрыт патрабаваліся дзецям для хадзьбы на хадунах. Хадзьба на хадунах была справай не простай, для авалодання ёю трэба было шмат трэніравацца. Гэта гульня захапляе перш за ўсё дзяцей больш старэйшага ўзросту.

Асноўнай рысай большасці беларускіх рухомых народных гульняў з'яўляецца тое, што яны патрабуюць шмат фізічнай энергіі, спрыту, кемлівасці, у выніку чаго дзеці атрымліваюць добрую фізічную нагрузку, загартоўку. Вясковыя дзеці ўжо ў падлеткавым узросце былі фізічна моцнымі і вынослівымі і маглі выконваць работы ў полі і па гаспадарцы, якія патрабавалі шмат сіл.

Трэба адзначыць, што ў сваім першапачатковым выкананні ўсе народныя гульні праводзіліся і праводзяцца на вуліцы і не патрабуюць ніякіх спецыяльных умоў і абсталявання. Гэта забяспечвае іх арганізацыю на свежым паветры даступнай, прычым сезоннасць беларускіх гульняў дазваляе праводзіць іх на працягу ўсяго года. Комплекснае ўздзеянне фізічнай актыўнасці і звычайных прыродных умоў на арганізм узмацняюць закаляючы эфект. Усе формы і сродкі традыцыйнай фізічнай культуры звязаны са звычайнымі ўмовамі, якія маюць важнае значэнне ў замацаванні здароўя дзяцей.

Народныя гульні ярка адлюстроўваюць лад жыцця людзей, іх побыт, працу, уяўленні аб гонары, адвазе, мужнасці. Гульня заўсёды была для дзіцяці крыніцай радасных эмоцый з вялікай выхаваўчай сілай. У народных гульнях захаваўся каларыт звычаяў, самавыяўлення народа, своеасаблівасць мовы, формы і змест гутарковых тэкстаў.

Дзеці любяць вясёлыя лічылкі, гульні: «— Заяц белы, куды бегаў? — У лес зялёны. — Што там рабіў? — Лыкі драў. — Куды клаў? — Пад калоду. — Хто скраў? — Радзівон. — Выйдзі вон!»

Такім чынам, гульня здаўна займала ў жыцці дзіцяці важнае месца. Дзякуючы ёй, дзеці прывучаліся самастойна знаходзіць выйсце з крытычнага становішча, хутка прымаць рашэнні і ажыццяўляць іх, праяўляць ініцыятыву, набывалі важныя якасці, неабходныя ім у будучым жыцці. Народныя гульні спрыялі фарміраванню гарманічна развітай асобы, якая спалучае ў сабе духоўнае багацце і фізічную дасканаласць [3, с. 54].

**Заключэнне.** Праграмны дакумент, па якім сёння працуюць педагогі дзіцячых устаноў дашкольнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь (вучэбная праграма дашкольнай адукыцыі), прадугледжвае шырокае выкарыстанне беларускіх рухомых гульняў у вучэбна-выхаваўчым працэсе. У праграме прапануюцца ўзроставыя размежаванні рухомых гульняў, але кожны выхавальнік ці фізічны кіраўнік можа сам адапціраваць іх і для пэўнага ўзросту, і для пэўных умоў. Самі дзеці, мадыфікуючы знаёмыя ім гульні, могуць стварыць новыя, развіваючы сваю творчую актыўнасць, творчыя здольнасці.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі (для ўстаноў дашкольнай адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання) / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. — Мінск : НІА, 2019. — 464 с.

2. *Лях, Н. У.* Беларускія народныя гульні ў фізічным выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту (з вопыту работы) / Н. У. Лях. — Мінск : Зор. Верасок, 2014. — 231 с.

3. *Шебеко, В. Н.* Физическая культура детей от пяти до шести лет : учеб.-метод. пособие для педагогов учреждений дошк. образования / В. Н. Шебеко. — Минск : Нац. ин-т образования, 2016. — 216 с.


Репозиторий БарГУ

УДК 373.24


**Зарожная Вольга Вітальеўна**

*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Гарадзішчанскі яслі-сад», г. п. Гарадзішча, Рэспубліка Беларусь, gorodistche-sad@baranovichi.edu.by*


## АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАЦЫ ПА САЦЫЯЛІЗАЦЫІ ДЗЯЦЕЙ У РОЗНАЎЗРОСТАВАЙ ГРУПЕ ПРАЗ ГУЛЬНЯВУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ


У дадзеным вопыце працы прадстаўлена абаснаванасць важнасці гульні ў сацыялізацыі дзяцей у рознаўзроставай групе. Раскрыта сутнасць працэсу сацыялізацыі ў рознаўзроставай групе дзіцячага сада праз гульнявую дзейнасць, асаблівасці яго рэалізацыі ва ўмовах дашкольнай установы. Прадстаўлена падборка гульняў, якія спрыяюць лепшай сацыялізацыі, накіраваныя на развіццё прафесійнай кампетэнтнасці педагогаў, развіваючага асяроддзя, якая забяспечвае самавызначэнне, самаактуалізацыю, самарэалізацыю кожнага дзіцяці ў адукацыйнай прасторы.


**Ключавыя словы:** гульнявая дзейнасць; зносіны; сацыялізацыя; рознаўзроставая група.

© Зарожная В. В., 2020

**Zarozhnaya Olga Vitalievna**
*Gorodishche Nursery-kindergarten, Gorodishche, Belarus, gorodistche-sad@baranovichi.edu.by*

# ORGANIZATION OF WORK ON SOCIALIZATION OF CHILDREN IN DIFFERENT AGE GROUPS THROUGH PLAY ACTIVITIES

In this work experience, the validity of the importance of play in the socialization of children in different age groups is presented. The essence of the process of socialization in a different age group of kindergarten through play activities, especially its implementation in a preschool institution. A selection of games that promote better socialization, aimed at the development of professional competence of teachers, developing environment that provides self-determination, self-actualization, self-realization of each child in the educational space.

**Key word:** game activity; communication; socialization; different age group.

**Уводзіны.** Ва ўстановах дашкольнай адукацыі гарадской і сельскай мясцовасці функцыянуюць як аднаўзроставыя, так і рознаўзроставыя групы. У сельскай мясцовасці значную частку складаюць установы дашкольнай адукацыі і навучальна-педагагічныя комплексы «Дзіцячы сад-школа» з адной ці некалькімі рознаўзроставымі групамі, якія валодаюць багатым выхаваўчым і развіваючым патэнцыялам, падаюць дзецям рознага ўзросту магчымасць сталых зносін і ўзаемадзеяння адзін з адным, спрыяюць паспяховай сацыялізацыі выхаванцаў, павялічваюць ролю ў іх самастойнай дзейнасці.

**Асноўная частка.** Сацыялізацыя дзяцей дашкольнага ўзросту — падмурак паспяховага ўваходжання падрастаючага пакалення ў далейшае жыццё, у школы, у адукацыйныя установы, на працу і ў асабістыя узаемаадносіны. У гэтым узросце закладваюцца найкаштоўныя навыкі зносін і асновы разумення ўласнага месца ў жыцці і грамадстве. Дзеці засвойваюць нормы і матывы паводзін, паняцці каштоўнасцяў, якія адпавядаюць соцыуму, у якім яны растуць. Наладжваецца сувязь паміж асноўнымі сферамі існавання дзяцей і іх псіхікай, якая ўплывае і на развіццё псіхікі. Недастатковасць сацыялізацыі вабіць за сабой самыя разнастайныя негатыўныя наступствы для асобы, пераадольваць якія тым складаней, чым больш было выпушчана на ранніх стадыях развіцця.

Гульнявая дзейнасць з’яўляецца вядучай у дашкольным узросце. У рамках гульнявой дзейнасці адбываецца сацыялізацыя дзіцяці, развіццё найважных псіхічных функцый — памяці, мыслення, успрымання, камунікатыўных навыкаў і г. д.; яе значэнне складана пераацаніць.

У дзіцячым садзе гульнявой дзейнасці адводзіцца вядучае месца, і яе правільная арганізацыя і развіццё навыкаў гульнявой дзейнасці — найважнейшая задача адмыслоўцаў дашкольнай установы адукацыі. Пры гэтым улічваюцца асаблівасці кожнай пэўнай групы дзіцячага саду, узровень развіцця дзяцей, псіхалагічныя асаблівасці, узрост, палавы склад і г. д. Адным з фактараў, які таксама вызначае асаблівасці арганізацыі гульнявой дзейнасці, з’яўляецца гэта рознаўзроставая група. Такія групы часцей за ўсё камплектуюцца ва ўмовах сельскага дзіцячага сада. Для выхавальнікаў існуе складанасць у арганізацыі кіраўніцтва дзіцячай гульнёй у рознаўзроставым калектыве з-за рознасці гульнявых інтарэсаў дзяцей, асаблівасцяў агульнага ўзроўню развіцця. Аднак рознаўзроставы дзіцячы калектыў мае і вялікі патэнцыял для развіцця гульнявой дзейнасці, асабліва гэта датычыцца дзяцей ранняга і малодшага дашкольнага ўзросту, якія сумесна з больш старэйшымі дзецьмі хутчэй і больш паспяхова авалодваюць шматлікімі гульнявымі ўменнямі і навыкамі. Для дзяцей старэйшага ўзросту такое ўзаемадзеянне карысна з пункту гледжання развіцця камунікатыўных навыкаў, эмпатыі, станоўчых адносін да малодшых дзяцей, самастойнасці.

Падчас рознаўзроставага ўзаемадзеяння магчымым становіцца ўзаемавыхаванне і ўзаеманавучанне, калі дзеці, як старэйшыя, так і малодшыя, атрымліваюць новыя веды, звычкі, уменні, замацоўваюць і абагульняюць іх. Старэйшыя адносна малодшых з’яўляюцца больш дасведчанымі, свайго роду настаўнікамі, а малодшыя сочаць за ўчынкамі, паводзінамі і дзейнасцю старэйшых. Любыя праблемы, якія ўзнікаюць, становяцца агульнымі. У рознаўзроставых групах ствараюцца эфектыўныя ўмовы для развіцця сацыяльнай кампетэнтнасці дашкольнікаў. Гэта адбываецца першым чынам дзякуючы таму, што ў такіх групах ёсць магчымасць узаемных зносін і ўзаемадзеяння дзяцей рознага ўзросту. Рознаўзроставая дзіцячая супольнасць мае большы патэнцыял для ўзроставага, асобаснага развіцця дашкольнікаў. Рознаўзроставыя групы з’ўляюцца дадатковай магчымасцю для маральнага развіцця дзіцяці, атрымання ім больш разнастайнага досведу гульнявога, сацыяльнага ўзаемадзеяння і натуральнага, моўнага і інтэлектуальнага развіцця. Дзіцячыя гульні разнастайныя па мэтах, утрыманню, арганізацыі [1].

Умоўна дзіцячыя гульні можна аб’яднаць у дзве вялікія групы: гульні з ускосным удзелам дарослага, дзе ствараюцца ўмовы для праяўлення дзецьмі самастойнасці і творчасці (сюжэтныя, сюжэтна-ролевыя, пазнавальныя) і гульні дыдактычнай (навучальнай) накіраванасці, у якіх дарослы, паведамляючы дзіцяці правілы гульні, задае паслядоўнасць дзеянняў. Усе віды гульняў уплываюць на развіццё дзіцяці. Сюжэтныя і сюжэтна-ролевыя гульні разнастайныя па сюжэце, умовам. Дыдактычныя гульні, якія навучаюць, накіраваны на рашэнне вызначаных задач развіцця. Гульні выконваюць значную ролю і як сродак маральна-этычнага выхавання дашкольнікаў. Можна адзначыць музычныя гульні, якія

Репозиторий БарГУ

могуць быць харавымі, сюжэтнымі і бессюжэтнымі, часта спалучаюць у сабе элементы дыдактычных і рухомых гульняў. Яны істотна ўплываюць не толькі на эстэтычнае выхаванне дашкольнікаў, але і на іх фізічнае і разумовае развіццё. Гульні-забаўлянкі павялічваюць эмацыйна-станоўчы тонус, спрыяюць развіццю рухальнай актыўнасці. Істотна, што гульні-забавы ствараюць спрыяльную глебу для ўсталявання эмацыйнага кантакту паміж дзецьмі і дарослымі. У гульні дзіця развіваецца як асоба, у яго фарміруюцца тыя бакі псіхікі, ад якіх пасля будуць залежаць паспяховасць яго навучальнай і працоўнай дзейнасці, адносіны з людзьмі [2].

У рознаўзроставай групе дзіцячага сада неабходна арганізаваць працу з дзецьмі такім чынам, каб было цікава і малодшым, і старэйшым дашкольнікам. Выкарыстанне гульняў дапамагае вырашыць дадзеную задачу і ў забаўляльнай дзейнасці, і на адмысловых тэматычных занятках. Гульні ўносяць разнастайнасць у выхаваўчы працэс, робяць яго эмацыйна насычаным, цікавым і, што самае каштоўнае, гульні дазваляюць вырашаць задачы развіцця і выхавання. У арганізацыі працы па сацыялізацыі ў рознаўзроставай групе гульні з'яўляюцца незаменным метадычным прыёмам актывізацыі дзейнасці і развіцця дзяцей.

Прапануем падборку гульняў, чарговасць якіх абумоўлена прынцыпам «ад простага да складанага». Прадстаўлены комплекс з чатырнаццаці гульняў, якія можна выкарыстоўваць пры арганізацыі працы па сацыяльна-камунікатыўным развіцці ў рознаўзроставай групе дзіцячага сада.

Гульня 1. «Раздзімайся, бурбалка!» Задача: навучыць дзіця паслядоўнаму выкананню дзвюх роляў — запрашанага і запрашальнага, даць яму магчымасць адчуць увагу іншых дзяцей і самому выявіць гэтую ўвагу.

Гульня 2. «Каруселі». Задача: навучыць дзяцей узгадняць свае рухі адзін з адным, з рытмам тэксту, што вельмі карысна для развіцця слыхавой увагі і кіравання сваімі рухамі.

Гульня 3. «Лялькі скачуць». Задача: навучыць дзяцей выконваць гульнявыя дзеянні па чарзе, невялікімі групамі. Паводзіны дзяцей у гульні рэгулююцца вызначанымі патрабаваннямі. Гульня арганізуе паводзіны дзяцей у сумеснай дзейнасці, вучыць карыстацца агульнымі цацкамі, перадаваць іх адзін аднаму.

Гульня 4. «Па дарожцы Валя ішла». Задача: развіваць у дзяцей актыўнае ўяўленне. Цэнтральным момантам гульні з'яўляецца выбар партнёра, які ажыццяўляецца дзіцем самастойна і служыць сродкам выраза сваёй перавагі і сімпатыі да аднагодкі.

Гульня 5. «Салачкі-даганялкі». Задача: выхаванне ў дзяцей адвагі, здольнасці мабілізавацца і пазбегнуць небяспекі.

Гульня 6. «Пустое месца». Задача: фарміраванне валявых якасцяў і навыкаў самарэгуляцыі.

Гульня 7. «Ліса і гусакі». Задача: выхаванне ў дзяцей арганізаванасці, уменне кіраваць сваімі паводзінамі ў калектыве.

Гульня 8. «Хто раней дойдзе да сцяжка?» Задача: выхаванне вытрымкі і ўмення кіраваць сабой.

Гульня 9. «Што я чую?» Задача: развіваць уменне прыслухоўвацца да навакольных гукаў, мэтанакіравана ўспрымаць і адрозніваць іх.

Гульня 10. «Хто абудзіў Мішутку?» Задача: навучыць дзяцей прыслухоўвацца да навакольных гукаў, мэтанакіравана ўспрымаць і адрозніваць іх.

Гульня 11. «Пазнай мяне». Задача: фарміраванне мэтанакіраванага ўспрымання гукаў. Гэта гульня складаней папярэдняй, бо тут дзецям трэба будзе не толькі пазнаць голас дзіцяці, але і вызначыць, якая цацка выдае той ці іншы гук.

Гульня 12. «Сустракайце гасцей». Задача: навучыць дзяцей вылучаць гук сярод іншых і ўспрымаць яго як сігнал якога-небудзь дзеяння ці падзеі.

Гульня 13. «Раз, два, тры — кажы!» Задача: навучыць дзяцей вылучаць некалькі розных умоў рашэння задачы і ўлічваць іх пры выкананні гульнявых дзеянняў. Адны з гэтых умоў патрабуюць пазнавальнай актыўнасці, а іншыя — валявых намаганняў.

Гульня 14. «Адгадай-ка!» Задача: развіваць у дзяцей цэласныя ўяўленні пра навакольныя прадметы. Цэласнае ўяўленне складаецца не толькі з вонкавых прыкмет прадмета, але і яго прызначэння [3].

Як сведчаць нашы назіранні, малодшыя дзеці ў рознаўзроставай групе ахвотна прыслухоўваюцца да парад, заўваг, адзнак старэйшых дзяцей, зробленых у добразычлівай форме, добра ўспрымаюць іх справядлівае кіраўніцтва сумеснай дзейнасцю і негатыўна рэагуюць на рэзкае і аўтарытарнае стаўленне. Пастаянныя зносіны малодшых дзяцей са старэйшымі фарміруюць сяброўскія адносіны, самастойнасць. Адмысловае значэнне набывае прыклад старэйшых для малодшых.

Выхавальніку трэба паклапаціцца, каб меншыя дзеці былі не пасіўнымі назіральнікамі, а актыўнымі ўдзельнікамі працэсу.

**Заключэнне.** Рэгулярнае правядзенне сумесных гульняў узбагачае дашкольнікаў новымі ўражаннямі, спрыяе фарміраванню навыкаў сацыяльнай кампетэнтнасці, дае ім новы сацыяльны вопыт, які вельмі важны для развіцця іх асобы.

Для дзяцей дашкольнага ўзросту неабходна ствараць адмысловую гульнявую прастору, у якой бы дзіця магло не проста ўступаць ва ўзаемаадносіны з аднагодкамі і блізкімі дарослымі, але і актыўна засвойваць веды, нормы, правілы грамадства, іншымі словамі, фарміраваць сацыяльна кампетэнтную асобу.

Репозиторий БарГУ

**Спіс цытаваных крыніц**

1. Дашкольнік у рознаўзроставай групе : метад. дапам. / Т. У. Кавалёва [і інш.]. — Мінск : У. М. Скакун, 1996.
2. *Жихар, О. П.* Разновозрастная группа: особенности планирования и организации образовательного процесса / О. П. Жихар. — Минск : Зорны Верасок, 2018.
3. Игра в жизни дошкольника : пособие для педагогов учреждений дошк. образования / Е. А. Панько [и др.] ; под ред. Я. Л. Коломинского, Е. А. Панько. — Мозырь : Белый Ветер, 2014.

УДК 378

**Зеленкевич Наталья Михайловна**
*Государственное учреждение образования «Жемчужненский ясли-сад», аг. Жемчужный, Республика Беларусь, i.pyl@mail.ru*

# ПЕДАГОГИЧЕСКИЕ УСЛОВИЯ РАЗВИТИЯ ЛЮБОЗНАТЕЛЬНОСТИ У ДЕТЕЙ МЛАДШЕГО ДОШКОЛЬНОГО ВОЗРАСТА

В статье отмечено, что ребёнок рождается исследователем. Неутолимая жажда новых впечатлений, любопытство, постоянное стремление наблюдать и экспериментировать, самостоятельно искать новые сведения о мире традиционно рассматриваются как важнейшие черты детского поведения. Удовлетворяя свою любознательность в процессе активной познавательно-исследовательской деятельности, которая в естественной форме проявляется в виде детского экспериментирования, ребёнок, с одной стороны, расширяет представления о мире, с другой – начинает овладевать основополагающими культурными формами упорядочения опыта: пространственными и временными отношениями, позволяющими связать отдельные представления в целостную картину мира.

**Ключевые слова:** любознательность; педагогические условия; развитие любознательности; дети младшего дошкольного возраста.

**Zelenkevich Natalia Mikhailovna**
*Zhemchuzhny Nursery-kindergarten, Zhemchuzhny, Belarus, i.pyl@mail.ru*

# PEDAGOGICAL CONDITIONS FOR THE DEVELOPMENT OF CURIOSITY IN CHILDREN OF EARLY PRESCHOOL AGE

The article notes that a child is born by to researcher. An unquenchable thirst for new experiences, curiosity, constant desire to observe and experiment, independently search for new information about the world, are traditionally considered as the most important features of children's behavior. Satisfying their curiosity in the process of active cognitive research activities, which naturally manifests itself in the form of child experimentation, the child, on the one hand, expands the idea of the world, on the other begins to master the fundamental cultural forms of ordering experience: spatial and temporal relationships that allow you to link individual views in a holistic picture of the world.

**Key words:** curiosity; pedagogical conditions; development of curiosity; children of early preschool age.

**Введение.** В настоящее время в детском саду одной из важнейших задач выступает развитие у детей любознательности. Это связано с тем, что любознательность играет главную роль в ходе развития личности ребёнка, в его познавательно-исследовательской деятельности. Любознательность является одной из сторон познавательной деятельности ребёнка и отражает его стремление искать новую информацию, осваивать ее в процессе познания окружающего мира. Я считаю, любознательность представляет собой цельное свойство личности, которое включает в себя соединение эмоциональных, интеллектуальных и волевых свойств.

В работе дошкольных образовательных учреждений развитию любознательности уделяется большое внимание, но часто это происходит бессистемно. Так как не всегда педагоги в должной мере владеют такими понятиями, как любознательность, познавательный интерес, педагогические условия развития любознательности у детей дошкольного возраста.

**Основная часть.** Целью данной статьи является: обосновать с помощью теории и рассмотреть подходы эффективного использования познавательно-исследовательской деятельности, как средства формирования любознательности у детей младшего дошкольного возраста. При изучении данной темы мною поставлены следующие задачи: проанализировать психолого-педагогическую литературу по проблеме исследования, выделить педагогические условия и особенности развития любознательности у детей младшего дошкольного возраста

Объектом исследования является процесс формирования любознательности у детей младшего дошкольного возраста. Предметом исследования выступают условия использования познавательно-исследовательской деятельности детей как средство развития любознательности.

Любознательность — психологическое свойство личности. Она характеризуется стремлением человека проникнуть за пределы увиденного. На этой стадии интереса обнаруживаются достаточно силь-

© Зеленкевич Н. М., 2020

Репозиторий БарГУ